Борсук Н.М.
(г. Брэст)

# “УСЁ, ШТО БАЧЫШ, ДУШОЮ ПРЫМІ”
## (зімовыя матывы ў творчасці М.Багдановіча і паэтаў Берасцейшчыны)

Зімовыя матывы ў творчасці М.Багдановіча вызначаюцца шматграннасцю, глыбінёй асэнсавання, складаюць адметную, хоць і нешматлікую старонку яго паэзіі. Яны вабяць сучаснікаў жыццесцвярджальным, аптымістычным пачаткам. Зімовая прырода ўлівае ў хворыя грудзі паэта спакой (верш “Зімовая дарога”), бадзёрыць, узрушае лірычнага героя М.Багдановіча (вершы “Завіруха”, “Падвей”),

мацуе яго душэўныя сілы (верш "Зімой), часам выклікае сум ("Зімовая дарога"), але ніколі не раздражняе, не даводзіць да адчаю.

Матыў радасці жыцця даволі адчувальны ў зімовай паэзіі берасцейцаў. Аб гэтым сведчыць назва верша А.Каско "Свята снегу". Першы снег асацыіруецца ва ўяўленні лірычнага героя паэта з вясновым цвіценнем яблынь (верш "Мяккай, белай цішынёй"). Зімовы малюнак сцішвае яго душэўны боль: "І скруху, / і тайную крыўду / ў бяскрайніх снягах утаплю" (верш "Зіма з тваім імем..."). У паэзіі Н.Мацяш зіма "цвіце натхнёнай, апантанаю завеяй" (верш "Лякаюцца: вярнулася зіма..."), нават у час адчаю "шугае маем завіруха" (верш "Я люблю цябе..."). Снегапады гераіня Н.Мацяш называе па-роднаму - "мае"(верш "Снегапад").

Зімовая паэзія М.Багдановіча ў цэлым выпраменьвае свет, але ж часам аптымістычная мелодыя верша перарываецца сумнымі ноткамі:"сумна бомы гудзяць", "маркотныя месяца рожкі" (верш "Зімовая дарога"). Мінорны матыў узнікае ў гэтым вершы толькі як водгалас ранейшых перажыванняў. Тужлівым настроем і нават страхам прасякнуты верш М.Багдановіча "На глухіх вулках - ноч глухая". Прыродная стыхія, завіруха сінтэзуе і з'яву прыроды, і сацыяльныя працэсы, якія вызначаюцца супярэчлівасцю, што падкрэсліваецца антонімамі, пастаўленымі побач, – стогн і смех. Лірычны герой верша, чалавек з абвостраным унутраным слухам, не адчувае сябе ўтульна сярод гарадской мітусні: "Ўвесь бледны, млосны прыхіліўся / Я ля ліхтарні да варот". Гул завірухі разрывае яго душу: "І вось той гул мне ў душу ўліўся". Не здольны прымірыць супярэчнасці горада М.Багдановіч і ў вершы "Завіруха". Дысгарманічны пачатак яскрава выяўлены ў наступных вобразах паэтычнага твора: вецер, снежнае віно, белая пена, дзікі хмель, сп'янелая мяцель.

Трагічнай падсветкай вызначаюцца зімовыя вершы нашых сучаснікаў. Негатыўныя маральныя зрухі, якія адбываюцца ў грамадстве, прыўносяць у сучасную паэзію тужлівы настрой. Гэтая думка, на наш погляд, яскрава сканцэнтравана ў паэтычных радках З.Дудзюк: "Усё са срэбра, зрэб'я і марозу". З аднаго боку, "шчодрая зіма" ўяўляецца яе гераіні "крыніцай усмешкі" (верш "Знайдзі мне новае імя"), супакойвае яе. З другога боку, дысгарманічны пачатак адбіваецца халадком у наступных радках паэтэсы: "жалобнае выццё завірух" (верш "Адлучаю цябе ад кахання"), "адгаравала, выцвіла зямля. / Да белаты адбеленае поле" (верш "Адгаравала, выцвіла зямля"). Праз словазлучэнне "ніякі снег" А.Каско ў вершы "Сняжыцца прыцемак. Са мной нікога" раскрывае стан адзіноты, абыякавасці, ў якім знаходзіцца яго лірычны герой. Самота, трывога за лёс роднага чалавека лірычнай гераіні Н.Мацяш перадаецца праз

пейзажную замалёўку: “на вуліцы вядзьмарыць завіруха”, “над светам белым / Драпежна сцюжа кружыць” (верш “Студзеньскі ліст”). Мінорны настрой не становіцца пануючым у паэзіі сучаснікаў. Праз судакрананне з паэзіяй як М.Багдановіча, так і сучасных паэтаў заўсёды застаецца ў душы чытача прывабнае святло, філасофскі роздум, здольнасць прыняць і ўлавіць жыццё ў яго кантрастах. Спашлемся на паэтычныя радкі З.Дудзюк “Холад космасу, веліч зімы”: “Усё, што бачыш, душою прымі”; Н.Мацяш: “Багаслаўляю лета і зіму!” (верш “Я думала, люблю адну вясну”).

У творчасці М.Багдановіча невялікая колькасць пейзажных вершаў - “сузіральніцкія па адносінах да прыроды” (выраз А.Лойкі). Пераважна ў сваёй лірыцы (гэта датычыцца ўсіх зімовых вершаў) праз далучэнне чалавека да царства прыроды паэт раскрывае ўнутраны свет асобы, “ у зліцці з гармоніяй прыроды імкнецца знайсці гармонію ў сабе” [1,72].

Да яднання са светам прыроды імкнецца і гераіня З.Дудзюк: “Ды няма ў нас ніякае тайны / Ад нябёсаў, бяроз і снягоў” (верш “Адарыла пяшчотай світанне”), Н.Мацяш (вершы “Адліга”, “Студзеньскі ліст”), лірычны герой М.Рудкоўскага (вершы ”А снег ідзе”,) “Пакуль што жывы ён, дзяцінства лес”, “Снежная рапсодыя”), А.Каско (верш “Свята снегу”). “Добры дзень” шчыра звяртаецца лірычны герой верша “Свята снегу” да прыроды. Тут відавочная пераклічка з М.Багдановічам, які адухаўляў прыроду і вітаў яе, як блізкага сябра: “Здароў, марозны, звонкі вечар”, “здароў, скрыпучы, мяккі снег”.

У зімовых вершах А.Каско паглыбляе матыў таемнага трыадзінства ўсяго, што “на небе, зямлі і на сэрцы”. Успрыняты аўтарам, адчуты, убачаны ім снег яднае высокае і зямное і становіцца набыткам чалавека (верш “Ты, старонка, - сама цішыня...”). “Белы-белы ды нялёгкі снег”, што падае на плечы лірычнага героя М.Рудкоўскага, узмацняе яго адчуванне знітаванасці “з зямлёю роднай і высокім небам” (верш “Іду к табе...”). Тэма яднання зямной і нябеснай красы ў зімовай паэзіі М.Багдановіча раскрыта ў другой страфе верша “Зімовая дарога”. Блізкі да паэтычнай карціны класіка радкі з А.Каско: “Стала ціха, і месячык глянуў. / Гурбы снегу вятры намялі. / Голлі дрэў - сотні рук веліканаў - / пасвятлелае неба ўзнялі” (верш “Стала ціха, і месячык глянуў”).

“Распрацоўка тэмы прыроды, яднання з ёю чалавека з’яўляецца своеасаблівым працягам тэмы Радзімы ў “Вянку,” - сцвярджае А.Лойка [2,21].На наш погляд, уяўленні чытача аб прыгажосці Радзімы пашыраюць сучасныя паэты не толькі напісаннем пейзажных зімовых вершаў, але і паэтычных твораў, у якіх развіваецца зімовая тэма. У вершы “Прыцярушыць першы снег” А.Каско паэтызуе хараство зімовага дня, які выклікае ў душы “ціхую радасць”. Праз яднанне з дзіўным светам

прыгажосці мы паступова набліжаемся да разумення, што "не, святло не дагарыць / і не раз душу абдыме, / покуль ёсць твае сябры, / покуль ёсць твая Радзіма". Праз эпітэты к слову снег - "цёплыя", "найсвятлейшыя" - М.Рудкоўскі перадае любоў да сваёй Радзімы (верш "Над Бацькаўшчынай - цёплыя снягі"). Праз дзіўнае яднанне слоў - снежань і палыхае ў вершы "Снегапад" ("палыхае разбуджаны снежань / над Нявой і маёй галавой...") паэт раскрывае чытачу трагічную сутнасць вайны, выяўляе патрэбу ўзнімацца над трафарэтнымі ўяўленнямі пра гераізм.

Як бачым, для паэтаў-сучаснікаў, як і для М.Багдановіча, прырода бачыцца крыніцай мудрасці. Праз яднанне з яе дасканалай, дзівоснa-непаўторнай прыгажосцю чалавек імкнецца да духоўнага ўдасканалення, паглыбляецца адчуванне знітаванасці з лёсам Бацькаўшчыны. Вершы, скразным матывам якіх стаў зімовы, вызначаюцца таксама філасафічнасцю, роздумам пра вечныя пытанні.

Разнастайнымі фарбамі, іх адценнямі жыве зіма ў паэзіі М.Багдановіча і нашых сучаснікаў. М.Багдановіч, як сведчыць аналіз зімовай лірыкі, аддае перавагу найперш серабрыстаму, сіняму, беламу колерам: "поле нікне ў срэбным тумане", "срэбнае раздолле", "снег бліпічыць, як халодная сталь", "унашуся я рызай у сінюю даль", "уюцца змейкай срабрастай дарожкі", "ускіпела снежнае віно, / і белай пенай мкне яно"... У творчасці нашых сучаснікаў пануе белы колер, які атаясамліваецца з чысцінёй, святлом, прыгажосцю, Радзімаю (вершы Н.Мацяш "Снегапад", А.Дэбіш "Зімовы дзень", А.Каско "Беларуская элегія", "Першы", М.Рудкоўскі "Ішоў к табе праз далі і гады" і інш.). Праведзены аналіз дадзеных вершаў сведчыць аб у кожным выпадку адметным, але эстэтычна вытанчаным і чуйным успрыманні названымі сучаснымі паэтамі прыроды свету.

З прыходам у беларускую паэзію М.Багдановіча, па перакананню У.Конана, "наша літаратура адкрыла эстэтыку начнога і зімовага іпастасяў быцця"[3,94]. Для паэта зімовы час - гэта час пошуку чалавекам унутраных сіл, каб пераадолець хаос распаду, што пануе ў чалавечых душах, каб падрыхтавацца да сустрэчы вясны. "Адраджэнне прыроды ў М.Багдановіча не звязана з яе веснавым абуджэннем. Яно пачынаецца ў чалавечай душы як надзея, прадчуванне" [4,482]. Дадзеная багдановічаўская традыцыя знаходзіць свой працяг у творчасці мастакоў слова Берасцейшчыны. Яскравы доказ гэтаму - вершы А.Дэбіша "Зімовых вечароў сняжок згусцелы", Н.Мацяш "Паварот на лета", "Жанчына вясну прыручала" і інш.

Інакш пачувае сябе зімой лірычны герой А.Каско (вершы "З гадоў былых...", "Цяпер працягнецца маўчанне"), гераіня З.Дудзюк. Сваё

адраджэнне яны звязваюць з вясновай парой. Калі ў М.Багдановіча ў разгуле завірухі ўзнік чалавек, якога апаноўвалі думы і вера, што "з няволі зімовай там рвецца "крэпка скутая снегам зямля" (верш "Ноч. Газніца гарыць, чырванее"), то зіму мы бачым нават у вачах гераіні З.Дудзюк: "зіма - пад небам, у вачах - зіма..."(верш "Адгаравала, выцвіла зямля"). Крыўдна паэтэсе ад таго, што людзі не заўважаюць таго становішча, у якім яны апынуліся, імя якому " як ні павярні: і так і гэтак - здрада"(верш "Цябе зіма прыпала, ты гэтаму і рады"). Пякучы боль сціскае душу гераіні З.Дудзюк, што зноў, як і раней ідзе працэс разбурэння асобы беларуса: "Нібы няма ніякай навокал перамены". Хоць гэты сказ па мэце выказвання апавядальны, але гучыць ён як пытальны. Ёсць перамены. Але, на жаль, у пераломны момант гісторыі мы, беларусы, зноў аказаліся не здольнымі ўтрымаць і пранесці дзеля нашчадкаў сцяг адраджэння. Вось як гаворыць паэтка пра тыповага беларуса, свайго суайчынніка: "Цябе зіма прыспала, ты гэтаму і рады". У канцы гэтага радка З.Дудзюк ставіць кропку, але ці паставім мы яе?

Такім чынам, да зімовых матываў звяртаюцца нашы сучаснікі не толькі для ўвасаблення пэўных момантаў духоўнага жыцця сваіх герояў, але пры выказванні адносін да грамадскіх падзей, да сучаснага жыцця беларускага народа.

Традыцыя, створаная М.Багдановічам па выяўленню зімовых матываў, стала своеасаблівым магнітным полем, з мастацкага прыцягнення якога не можа выйсці не адзін значны талент. І ў той жа час кожны мастак слова, звярнуўшыся да вытокаў з творчай практыкі М.Багдановіча, бліскуча рухаецца па свайму ўласнаму паэтычнаму шляху. Менавіта аб гэтым сведчыць вышэй праведзены аналіз.

## ЛІТАРАТУРА

1 Лойка А. Максім Багдановіч. Мн., 1966.

2 Лойка А. Паэт нараджаецца не аднойчы / Максім Багдановіч. Зб.тв.: У 3 т. Мн., 1991. Т.І.

3 Конан У. Святло паэзіі і цені жыцця. Мн., 1991.

4 Чабан Т. Космас "Вянка" / Максім Багдановіч. Зб.тв.: У 3 т. Мн., 1991. Т. І.